# ЖАНР АНТЫЎТОПІІ Ў ТВОРЧАСЦІ У. КЛІМОВІЧА

М.У. Шкрэблік

За шматлікімі плынямі фантастыкі, якая выпускаецца тысячамі выдавецтваў зямнога шара, не паспець нават самым заўзятым аматарам навукова-фантастычнай літаратуры. Таму ўдвая крыўдна, калі чытачы не маюць доступу да кніг таленавітых пісьменнікаў, што, на жаль, здаралася ў нашай краіне ў нядаўнія гады. І, мабыць, асабліва не шанцавала кнігам, напісаным у жанры антыўтопіі. Лічылася, што такія творы выходзяць з-пад пяра расчараваных у жыцці песімістаў-скептыкаў, а змрочны каларыт футуралагічных карцін негатыўна ўплывае на маладое пакаленне.

Асноўныя каноны антыўтопіі сфарміраваліся і ўсталяваліся ў мастацтве слова ў XX стагоддзі. Цэнтральнымі праблемамі твораў гэтага напрамку фантастычнай літаратуры з’яўляюцца двайная мараль, псіхалогія “вінцікаў”, якая непазбежна нараджае інертнасць соцыуму, дагматычная ўпэўненасць у тым, што пабудаванае людзьмі грамадства – ідэальнае, а таму не патрабуе і не дапускае крытычнага абмеркавання. Спецыфічнай адметнасцю беларускай антыўтопіі ў раскрыцці згаданых матываў выступае акцэнт на праблемах маральна-філасофскага плана: цэнтральным аб’ектам мастацкага даследвання з’яўляецца не навуковы і сацыяльны прагрэс, а найперш духоўны стан грамадства. Іншымі словамі, пісьменнікаў хвалюе пытанне: ці зможа чалавецтва, прайшоўшы выпрабаванне часам, захаваць сябе, не згубіць высокіх памкненняў і ідэй.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Яскравым прыкладам такога погляду на будучыню з'яўляецца шэраг антыўтопій, напісанных таленавітым сучасным пісьменнікам Уладзімірам Клімовічам. Яго кароткія апавяданні прасякнуты ўвагай да чалавечай асобы, хваляваннем за захаванне яе індывідуальнасці, незалежнасці і свабоды. Пры імкліва-дынамічным характары сюжэтаў яго твораў галоўная роля адводзіцца не скрупулёзнаму апісанню падзей, а перадачы ўнутраных перажыванняў герояў, іх думкам, марам, турботам. Паказальным у гэтым плане з'яўляецца апавядане "Сістэма Баслі". Пісьменнік стварае незвычайную мадэль будучыні: краіну, дзе толькі адзінкі выбіваюцца з агульнай сістэмы і займаюцца ўласнай працай без нагляду "вышэйшага розуму". Галоўнай мэтай жыцця Габрыэля Баслі становіцца атрыманне такой прафесіі. Для яе дасягнення герой выжывае ў раз'юшаным бурай моры, прымае ўдзел у англа-бурскай вайне, змагаецца за сваё жыццё на арэне старажытнага амфітэатра, у Мезазойскую эру ўступае ў схватку з магутнейшым параджэннем прыроды – стэгазаўрам. І, нарэшце, Габрыэль атрымлівае тое, да чаго так імкнуйся ўсёй сваёй душой… "Незалежную" працу смецяра!.. Эфект дарэмнасці, нікчэмнасці высілкаў і намаганняў героя ўзмацняецца тым фактам, што ён адчувае сябе бязмежна шчаслівым, бо нарэшце атрымлівае жаданую свабоду. Такая рэакцыя Баслі сведчыць пра спраўджанасць яго мары, што першапачаткова ўспрымаецца чытачом як ілюзорная. Аднак абсурднасць створанай У. Клімовічам сітуацыі і адарванасць яе ад рэальнага жыцця толькі ўяўная, калі разглядаць яе праз прызму сённяшняй рэчаіснасці. Камп'ютары, якія сустракаюцца на кожным кроку, разумныя робаты, што ствараюць для чалавека разнастайную тэхніку, дапамагаюць вопытным урачам рабіць самыя складаныя аперацыі… Пры гэтым у апавяданні гучыць не прапанова адмовіцца ад тэхнічнага прагрэсу, а папярэджанне аўтара аб тым, куды можа прывесці імкненне чалавека да абсалютнага камфорту, да поўнай упэўненасці ў заўтрашнім дні. Здабыткі цывілізацыі могуць быць каласальнымі па размаху і ступені сваёй карыснасці, але могуць даць і адмоўныя вынікі. Так аўтар глыбока даследуе феномен свабоды, яе значнасць і абсалютную ролю ў жыцці кожнага індывіда.

Зусім іншай будучыня выглядае ў творах-антыўтопіях аўтара "Чацвёртая ад Рэгула". У іх пісьменнік яшчэ больш паглыбіўся ў нетры чалавечай сутнасці. На фоне чарговага "вялікага будаўніцтва" на далёкай планеце перад чытачом разгортваецца лёс маленькай дзяўчынкі Эльзы, якая захварэла, і захварэла вельмі

РЭПОЗІТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сур'ёзна. Аўтар, як тонкі псіхолаг, раскрывае ў сваім творы ўсе супярэчнасці складанай дзіцячай душы. Эльза марыць стаць штурманам, займець сапраўдны чорны касцюм з бліскучымі маланкамі па швах і разам са сваёй улюбёнай лялькай Ціп-Чакам даляцець калі-небудзь да далёкай Блакітнай Гарошыны. Хворае дзіця не хвалюецца, што хутка памрэ. Гэта думка атручвае жыццё яе бацькам. Выразнай мастацкай дэталлю выступае маленькае акно іх пакойчыка сярод шматлікіх іншых, такіх жа маленькіх. Аўтар прадстаўляе парадаксальнасць развіцця высокаарганізаванага грамадства, якое ў гуманістычных мэтах здольна, але не можа выратаваць жыццё ці хаця б здзейсніць запаветную мару маленькай дзяўчынкі. У. Клімовіч піша: "Але ўся гэтая агромістая праца не будзе вартая і патухлай кроплі метэарытнага дажджу, калі аднойчы ад планеты не адарвецца зорны карабель і за яго штурвалам … не будзе стаяць Эльза, углядаючыся ў цемру блакітнымі вачыма" [2, с. 148]. Так за высокімі ідэаламі чалавецтва застаецца забыты сам чалавек.

Такім чынам, створаная У. Клімовічам будучыня пазбаўлена рамантычнай ідэалізацыі і утапічных поглядаў на далейшае развіццё чалавецтва. Асноўную прычыну ў немагчымасці стварыць дасканалае грамадства пісьменнік бачыць у праблемах маральна-філасофскага плана. "Наколькі тонкі пласт цывілізацыі і культуры ў душы чалавека і як перагнаў прагрэс навукі прагрэс духоўны" [1, с. 306], заўважае Г. Варонава. Але нягледзячы на гэта, створаныя аўтарам антыўтопіі глыбока гуманістычныя: яны прасякнуты увагай да чалавечай асобы і шчырым хваляванне за яе будучы лёс.

1. Варонава Г. У краіне антыўтопіі // Полымя. – 2001. – № 10. – С. 267-310.

2. Клімовіч У. Той, хто будуе горад. – Мн.: Маст. літ., 1997. – 221 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ